ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр юстыцыі
Рэспублікі Беларусь

В.Р.Галаванаў

31 сакавіка 2010 года

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## па выніках разгляду матэрыялаў аб дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Малады Фронт»

Упраўленнем грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы адносна дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Малады Фронт» (далей – МГА «Малады Фронт»). Пры іх вывучэнні ўстаноўлена наступнае.

Згодна заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Малады Фронт» ад 23 лютага 2010 г., рашэнне аб стварэнні МГА «Малады Фронт» прынята на Устаноўчым З'ездзе, які адбыўся 30 студзеня 2010 г. у г. Мінску.

Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і пералік неабходных для гэтага дакументаў, неабходных для прадстаўлення рэгіструючаму органу, утрымліваецца ў артыкуле 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", у адпаведнасці з часткай шостай якога для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў абавязковым парадку прадстаўляецца дакумент, які пацвярджае наяўнасць юрыдычнага адрасу грамадскага аб'яднання (месца знаходжання кіруючага органа).

Вывучэнне прадстаўленных дакументаў аб наяўнасці юрыдычнага адрасу ў МГА «Малады Фронт», указаннага ў падпункце 1.3 пункта 1 Статута МГА «Малады Фронт» паказала, што юрыдычным адрасам (месца знаходжання кіруючага органа) МГА «Малады Фронт» з'яўляецца кватэра (жылое памяшканне) у шматкватэрным жылым доме па адрасу:

У адпаведнасці з артыкулам 8 Жыллёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь жылыя памяшканні прызначаюцца для пражывання грамадзян, што сведчыць аб устанаўленні для іх спецыяльнага прававога рэжыму мэтавага выкарыстання. Выкарыстанне не па назначэнню прыгодных для пражывання жылых памяшканняў не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, МГА «Малады Фронт» не прадставіла ў Міністэрства юстыцыі пацвярджэння наяўнасці юрыдычнага адрасу, якое б адпавядала патрабаванням заканадаўства, што згодна з абзацам чацвёртым артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях” з’яўляецца падставай для прыняцця рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб’яднання.

У адпаведнасці з пунктамі першым, другім артыкула 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, кожны чалавек мае права на свабоду асацыяцый з другімі, уключая права ствараць прафсаюзы і ўступаць у такія для абароны сваіх інтарэсаў. Карыстанне гэтым правам не падлягае ніякім абмежаванням, акрамя тых, якія прадугледжваюцца законам і якія неабходны ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя і маральнасці насельніцтва ці абароны правоў і свабод другіх асобаў.

Згодна са звесткамі, якія маюцца ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, 43 заснавальніка МГА «Малады Фронт» (больш паловы ад іх агульнай колькасці), у тым ліку амаль усе члены кіруючага органа дадзенага грамадскага аб’яднання, прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, многія з іх неаднаразова, у тым ліку за правапарушэнні, звязаныя з парушэннем грамадскага парадка, правоў і свабод другіх асобаў. З іх: старшыня МГА «Малады Фронт» Дашкевіч Дз.В. – 16 разоў, Жукоўскі К.І. – 23 разы, Шыла І.У. – 17 разоў, Кутасаў Д.В., Самойлава К.С. – 13 разоў, Мацвееў Р.А., Карноў Дз.Э. – 11 разоў, Валабуеў А.В. – 9 разоў, Атакулава М.Б., Ільін М.А. – 8 разоў, Кур’яновіч П.У. – 7 разоў, Кучынскі С.С., Дземідзенка М.В., Бароўскі В.У., Кухлей Дз.А. – 6 разоў, Літвінскі К.Ю. – 5 разоў, Шыла І.У. – 4 разы, Гагалюк Н.А. – 3 разы, Палажэнка Н.У., Батуеў П.С., Хадакоўская Н.А., Папоў П.Р., Шапуцька Т.В., Мацкевіч В.В., Якавенка Я.Я., Ясевіч Д.А. – 2 разы, Жук П.М., Лойка Н.Ю., Карповіч А.А., Лінкоў Д.М., Макарэвіч А.В. – 1 раз.

Такім чынам, больш паловы заснавальнікаў МГА «Малады Фронт» з’яўляюцца правапарушальнікамі і колькасць прыцягненняў іх да прадугледжанай заканадаўствам адказнасці не сведчаць аб іх намеры ажыццяўляць дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам. Пры гэтым трэба ўлічыць, што шэраг з іх здзейснілі такія правапарушэнні грамадскага парадку, правоў і свабод другіх асобаў, як:

- парушэнне ўстаноўленнага парадка арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства ці пікетавання;
- парушэнне ўстаноўленнага парадка карыстання сцягамі, вымпеламі, не зарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку, а таксама карыстанне эмблемамі, сімваламі, плакатамі, змест якіх накіраваны на

прычыненне ўрону канстытуцыйнаму строю і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян, на рэлігійных, спартыўных, культурна-масавых, іншых відовішчных мерапрыемствах, а таксама карыстанне пералічаным вышэй на сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні;

- уцягванне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны;
- распаўсюджванне друкаваных выданняў, якія выраблены з парушэннем устаноўленнага парадка і не маюць выходных дадзеных, змест якіх накіраваны на прычыненне ўрону дзяржаўнаму і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян.

На падставе выкладзеннага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14, абзацам чацвёртым часткі трэцяй артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях”, лічым магчымым адмовіць у дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Малады Фронт».

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб’яднанняў А.Л.Сліжэўскі

06 Какуша 230
31.03.2010. Заключэнне